ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.06.2021 № 135

# ТЫПАВАЯ ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ (ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ) ”БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)“

прафесійнага кампанента тыпавых вучэбных планаў
па спецыяльнасцях (накірунках спецыяльнасцей)
(акрамя спецыяльнасці 2-26 02 31 ”Дакументазнаўства
і дакументацыйнае забеспячэнне кіравання“) для рэалізацыі
адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі,
якія забяспечваюць атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага),
для рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі,
якія забяспечваюць атрыманне кваліфікацыі спецыяліста (рабочага)
з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дадзеная тыпавая вучэбная праграма па вучэбным прадмеце (вучэбнай дысцыпліне) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ (далей – праграма) прадугледжвае вывучэнне асаблівасцей беларускай мовы, пашырэнне і ўзбагачэнне лексічнага запасу, неабходнага для прафесійнай дзейнасці будучых рабочых (служачых) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, спецыялістаў (рабочых) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, а таксама выпрацоўку ўмення карыстацца тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці (накірунку спецыяльнасці). Праграма з’яўляецца абагуленай для ўсіх спецыяльнасцей прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (акрамя спецыяльнасці 2-26 02 31 ”Дакументазнаўства і дакументацыйнае забеспячэнне кіравання“).

У працэсе выкладання вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ неабходна ўлічваць міждысцыплінарныя сувязі праграмнага вучэбнага матэрыялу з вучэбным матэрыялам вучэбных прадметаў (вучэбных дысцыплін) прафесійнага кампанента тыпавых вучэбных планаў па спецыяльнасцях (накірунках спецыяльнасцей).

Усе заняткі па вучэбным прадмеце (вучэбнай дысцыпліне) носяць практычны характар.

З мэтай кантролю засваення праграмнага вучэбнага матэрыялу прадугледжана выкананне адной абавязковай кантрольнай работы, заданні для якой распрацоўваюцца выкладчыкам вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ і абмяркоўваюцца на пасяджэнні прадметнай (цыклавой) камісіі ўстановы адукацыі.

У праграме вызначаны мэты вывучэння кожнай тэмы, спрагназаваны вынікі іх дасягнення ў адпаведнасці з узроўнямі засваення вучэбнага матэрыялу. З мэтай арганізацыі прафесійна арыентаванага маўлення ў змесце кожнай тэмы прадугледжана лексіка-тэрміналагічнае напаўненне.

У выніку вывучэння вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ навучэнцы павінны:

ведаць на ўзроўні ўяўлення:

ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;

функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;

ведаць на ўзроўні разумення:

нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

функцыянальныя стылі і іх выкарыстанне ў маўленчай дзейнасці;

тэрміналогію і прафесійную лексіку па абранай спецыяльнасці;

тэрміналагічныя слоўнікі па адпаведных сферах прафесійнай

дзейнасці;

умець:

успрымаць і ўзнаўляць навуковую галіновую інфармацыю на беларускай мове;

перакладаць, пераказваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты, рыхтаваць публічныя выступленні;

вылучаць істотныя факты са спецыяльных тэкстаў пры чытанні і ўспрыняцці маўлення на слых;

правільна афармляць дзелавыя дакументы;

ажыццяўляць прафесійнае маўленне ў розных сітуацыях зносін.

У дадзенай праграме прыведзены прыкладныя крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па вучэбным прадмеце (вучэбнай дысцыпліне) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“, распрацаваныя на аснове дзесяцібальнай шкалы і паказчыкаў ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі; прыкладны пералік абсталявання кабінета тэхнічнымі і дэманстрацыйнымі сродкамі навучання, неабходнымі для забеспячэння адукацыйнага працэсу. Ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, ацэнку вынікаў вучэбнай дзейнасці ажыццяўляюць у адпаведнасці з адукацыйным стандартам прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Прыведзены ў дадзенай праграме прыкладны тэматычны план з’яўляецца рэкамендаваным. Пры неабходнасці змянення дадзенай праграмы ўстанова адукацыі, якая ажыццяўляе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай (сярэдняй спецыяльнай) адукацыі, распрацоўвае на яе аснове вучэбную праграму ўстановы адукацыі. Прадметная (цыклавая) камісія ўстановы адукацыі можа ўносіць абгрунтаваныя змены ў змест і паслядоўнасць выкладання праграмнага вучэбнага матэрыялу, размеркаванне вучэбных гадзін па тэмах у межах агульнага бюджэту часу, адведзенага на вывучэнне вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“. Вучэбная праграма ўстановы адукацыі зацвярджаецца яе кіраўніком.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзел, тэма | Колькасць вучэбных гадзін |
|---|---|
| Раздзел I. **Беларуская мова ў грамадстве** | **3** |
| 1.1. Мова ў грамадстве | 1 |
| 1.2. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму | 1 |
| 1.3. Нормы беларускай літаратурнай мовы | 1 |
| Раздзел II. **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | **3** |
| 2.1. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання | 1 |
| 2.2. Спецыяльная лексіка. Беларуская навуковая тэрміналогія. Тэрміналагічныя слоўнікі | 2 |
| Раздзел III. **Функцыянальныя стылі маўлення** | **8** |
| 3.1. Навуковы стыль. Моўныя сродкі навуковага стылю | 2 |
| 3.2. Пераклад і аналіз прафесійна арыентаванага тэксту | 2 |
| 3.3. Публіцыстычны стыль | 2 |
| 3.4. Афіцыйна-справавы стыль | 2 |
| Раздзел IV. **Культура прафесійнага маўлення** | **6** |
| 4.1. Прафесійна арыентаванае маўленне. Падрыхтоўка да публічнага выступлення на прафесійную тэму | 3 |
| Абавязковая кантрольная работа | 1 |
| 4.2. Маўленчы этыкет і культура маўлення | 2 |
| **Усяго** | **20** |

# ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

| Мэта навучання | Змест тэмы | Вынік |
|---|---|---|
| РАЗДЗЕЛ I. **БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ГРАМАДСТВЕ** | | |
| Тэма 1.1. **Мова ў грамадстве** | | |
| Пазнаёміць з мэтамі і задачамі вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“, роляй і месцам вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ ў сістэме падрыхтоўкі рабочых (служачых) з прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй, спецыялістаў (рабочых) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.<br>Сфарміраваць паняцці ”мова“ і ”маўленне“.<br>Замацаваць веды аб ролі мовы ў жыцці чалавека і грамадства, аб функцыях мовы. | Мэты і задачы вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“. Месца вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яе сувязь з іншымі вучэбнымі прадметамі (вучэбнымі дысцыплінамі) па спецыяльнасці (накірунку спецыяльнасці).<br>Паняцці ”мова“ і ”маўленне“. Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Функцыі мовы. | Называе мэты і задачы вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“, выказвае агульнае меркаванне пра ролю і месца вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ ў сістэме падрыхтоўкі рабочых (служачых) з прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй, спецыялістаў (рабочых) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.<br>Раскрывае сутнасць паняццяў ”мова“ і ”маўленне“.<br>Вызначае ролю мовы ў жыцці чалавека і грамадства, тлумачыць функцыі мовы. |
| Тэма 1.2. **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму** | | |
| Сфарміраваць паняцці ”білінгвізм“, ”моўная інтэрферэнцыя“.<br>Сфарміраваць веды пра віды моўнай інтэрферэнцыі.<br>Навучыць вызначаць і выпраўляць моўныя памылкі, якія ўзнікаюць у выніку моўнай інтэрферэнцыі. | Паняцці ”білінгвізм“ і ”моўная інтэрферэнцыя“.<br>Віды моўнай інтэрферэнцыі.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Будучая спецыяльнасць, прафесія.<br>Асноўныя віды прафесійнай дзейнасці.<br>Кампетэнцыі спецыяліста. | Тлумачыць паняцці ”білінгвізм“ і ”моўная інтэрферэнцыя“.<br>Акрэслівае віды моўнай інтэрферэнцыі.<br>Вызначае і выпраўляе моўныя памылкі, якія ўзнікаюць у выніку моўнай інтэрферэнцыі. |
| Тэма 1.3. **Нормы беларускай літаратурнай мовы** | | |
| Узнавіць і паглыбіць веды аб моўных | Правільнасць маўлення і моўныя нормы | Тлумачыць моўныя нормы беларускай |

| Мэта навучання | Змест тэмы | Вынік |
|---|---|---|
| нормах беларускай літаратурнай мовы.<br>Выпрацаваць практычныя навыкі карыстання нормамі беларускай літаратурнай мовы ў моўным асяроддзі і пры аналізе прафесійна арыентаваных тэкстаў.<br>Навучыць выпраўляць маўленчыя памылкі ў прафесійна арыентаваных тэкстах. | (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, способы выпраўлення.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Прафесійнае самавызначэнне асобы.<br>Матывы выбару прафесіі.<br>Перспектывы прафесійнага росту. | літаратурнай мовы.<br>Карыстаецца нормамі беларускай літаратурнай мовы ў моўным асяроддзі і пры аналізе прафесійна арыентаваных тэкстаў.<br>Выпраўляе маўленчыя памылкі ў прафесійна арыентаваных тэкстах. |

## РАЗДЗЕЛ II. **ЛЕКСІЧНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ**

### Тэма 2.1. **Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання**

| | | |
|---|---|---|
| Узнавіць і паглыбіць веды пра лексіку беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання.<br>Навучыць вызначаць прыналежнасць слоў да пэўнай групы паводле паходжання і сферы ўжывання. | Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжытку.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Гісторыя прафесіі і перспектывы яе развіцця. Асноўныя віды дзейнасці і кампетэнцыі спецыяліста. | Апісвае лексіку беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання.<br>Вызначае прыналежнасць слоў да пэўнай групы паводле паходжання і сферы ўжывання. |

### Тэма 2.2. **Спецыяльная лексіка. Беларуская навуковая тэрміналогія. Тэрміналагічныя слоўнікі**

| | | |
|---|---|---|
| Сфарміраваць веды пра спецыяльную лексіку, тэрміналогію, адрозненні паміж прафесіяналізмамі, тэрмінамі і наменклатурнымі назвамі.<br>Замацаваць паняцце пра структуру, прызначэнне тэрміналагічных слоўнікаў і даведнікаў.<br>Навучыць рабіць аналіз прафесійна арыентаваных тэкстаў. | Паняцці ”спецыяльная лексіка“, ”тэрміналогія“, ”прафесіяналізмы“, ”тэрміны“, ”наменклатурныя назвы“.<br>Беларуская тэрміналогія.<br>Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі. Сістэма падачы тэрмінаў у слоўніках.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Абсталяванне, інструменты, прыстасаванні, неабходныя ў прафесійнай | Раскрывае сутнасць паняццяў ”спецыяльная лексіка“, ”тэрміналогія“, ”прафесіяналізмы“, ”тэрміны“, ”наменклатурныя назвы“. Тлумачыць адрозненні паміж прафесіяналізмамі, тэрмінамі, наменклатурнымі назвамі.<br>Апісвае структуру, прызначэнне тэрміналагічных слоўнікаў і даведнікаў.<br>Аналізуе прафесійна арыентаваныя |

| Мэта навучання | Змест тэмы | Вынік |
| --- | --- | --- |
| | дзейнасці.<br>Матэрыялы (сыравіна), што выкарыстоўваюцца ў вытворчых працэсах. | тэксты. |
| РАЗДЗЕЛ III. **ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ СТЫЛІ МАЎЛЕННЯ** | | |
| Тэма 3.1. **Навуковы стыль. Моўныя сродкі навуковага стылю** | | |
| Сістэматызаваць і паглыбіць веды пра функцыянальныя стылі.<br>Замацаваць веды пра лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці тэкстаў навуковага стылю.<br>Выпрацоўваць уменне пераказваць, аналізаваць і рэферыраваць навуковы тэкст.<br>Навучыць успрымаць і ўзнаўляць навуковую галіновую інфармацыю на беларускай мове. | Класіфікацыя функцыянальных стыляў.<br>Навуковы стыль. Функцыі навуковага стылю. Жанры навуковага стылю, іх адметныя асаблівасці і моўныя сродкі.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Вытворчы працэс, тэхналагічнае абсталяванне, патрабаванні бяспекі пры эксплуатацыі абсталявання.<br>Аб’ект прафесійнай дзейнасці. | Раскрывае асаблівасці функцыянальных стыляў.<br>Тлумачыць лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці тэкстаў навуковага стылю.<br>Пераказвае, аналізуе і рэферыруе навуковы тэкст.<br>Дэманструе ўменне ўспрымаць і ўзнаўляць навуковую галіновую інфармацыю на беларускай мове. |
| Тэма 3.2. **Пераклад і аналіз прафесійна арыентаванага тэксту** | | |
| Замацаваць веды пра асаблівасці перакладу навуковых тэкстаў на беларускую мову.<br>Замацаваць навыкі перакладу і аналізу прафесійна арыентаванага тэксту. | Асаблівасці перакладу навуковых тэкстаў на беларускую мову.<br>Пераклад на беларускую мову навуковых тэкстаў і прафесійна арыентаваных тэкстаў.<br>Аналіз прафесійна арыентаваных тэкстаў. | Тлумачыць асаблівасці перакладу навуковых тэкстаў на беларускую мову.<br>Выконвае пераклад прафесійна арыентаванага тэксту з выкарыстаннем адпаведнага тэрміналагічнага слоўніка, аналізуе тэкст. |
| Тэма 3.3. **Публіцыстычны стыль** | | |
| Сістэматызаваць і паглыбіць веды пра лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю.<br>Навучыць ствараць рэкламу ўласнай | Сфера ўжывання, формы рэалізацыі, функцыі і вызначальныя рысы публіцыстычнага стылю. Жанры публіцыстычнага стылю, іх адметныя асаблівасці. | Тлумачыць характэрныя лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю.<br>Стварае тэкст публіцыстычнага стылю – рэкламу ўласнай прафесіі. |

| Мэта навучання | Змест тэмы | Вынік |
|---|---|---|
| прафесіі. | Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Рэклама прафесіі. | |
| Тэма 3.4. **Афіцыйна-справавы стыль** | | |
| Замацаваць веды пра асаблівасці афіцыйна-справавога стылю, віды афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>Навучыць перакладаць службовыя інструкцыі, складаць рэзюмэ, аўтабіяграфію, заяву аб прыёме на работу. | Функцыі афіцыйна-справавога стылю.<br>Стылявыя прыкметы і моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю.<br>Віды афіцыйна-справавых тэкстаў. Правілы напісання і афармлення афіцыйна-справавых тэкстаў. Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Рэзюмэ, аўтабіяграфія, заява аб прыёме на работу.<br>Нарматыўныя прававыя акты, тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, службовыя інструкцыі. | Вызначае асаблівасці афіцыйна-справавога стылю, віды афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>Перакладае службовыя інструкцыі. Складае рэзюмэ, аўтабіяграфію, заяву аб прыёме на работу. |
| РАЗДЗЕЛ IV. **КУЛЬТУРА ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ** | | |
| Тэма 4.1. **Прафесійна арыентаванае маўленне. Падрыхтоўка да публічнага выступлення на прафесійную тэму** | | |
| Сфарміраваць веды пра культуру маўлення, камунікатыўныя якасці маўлення.<br>Сфарміраваць навыкі падрыхтоўкі тэксту прафесійна арыентаванага публічнага выступлення з улікам асноўных патрабаванняў. | Паняцце культуры маўлення. Прафесійна арыентаванае маўленне.<br>Камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, чысціня, багацце, дарэчнасць, сцісласць).<br>Патрабаванні да прамовы.<br>Падрыхтоўка да публічнага выступлення.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне: | Тлумачыць паняцце ”культура маўлення“, апісвае камунікатыўныя якасці маўлення.<br>Вызначае асаблівасці прафесійна арыентаванаго маўлення.<br>Стварае прафесійна арыентаваны тэкст для выступлення. Выступае перад аўдыторыяй з публічнай прамовай на прафесійную тэму з улікам асноўных |

| Мэта навучання | Змест тэмы | Вынік |
|---|---|---|
| | Прапанова па ўдасканаленні вырабу прадукцыі (паляпшэнні якасці паслуг). | патрабаванняў. |
| Абавязковая кантрольная работа | | |
| Тэма 4.2. **Маўленчы этыкет і культура маўлення** | | |
| Сфарміраваць паняцці ”маўленчы этыкет“, ”тэхніка маўлення“, ”выразнасць маўлення“.<br>Выпрацаваць навыкі дыялагічнага маўлення ў адпаведнай моўнай сітуацыі і з захаваннем правіл маўленчага этыкету. | Маўленчы этыкет і культура зносін. Тэхніка і выразнасць маўлення.<br>Лексіка-тэрміналагічнае напаўненне:<br>Знаёмства, дзелавое прадстаўленне.<br>Суразмова аб прыёме на работу (умовы працы, службовыя абавязкі, працоўны дзень). | Раскрывае сутнасць паняццяў ”маўленчы этыкет“, ”тэхніка маўлення“, ”выразнасць маўлення“.<br>Вядзе прафесійна арыентаваны дыялог у сітуацыі афіцыйных маўленчых зносін у адпаведнай моўнай сітуацыі, прытрымліваецца правіл маўленчага этыкету. |

# ПРЫКЛАДНЫЯ КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

| Адзнака у балах | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Пазнаванне асобных аб’ектаў вывучэння праграмнага вучэбнага матэрыялу, прапанаваных у гатовым выглядзе (фактаў, тэрмінаў, азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка)) |
| 2 (два) | Адрозненне аб’ектаў вывучэння праграмнага вучэбнага матэрыялу, прапанаваных у гатовым выглядзе (фактаў, тэрмінаў, азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), асобных правілаў маўлення) |
| 3 (тры) | Узнаўленне часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці (фрагментарны пераказ і пералічэнне асноўных тэрмінаў, азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); ажыццяўленне разумовых і практычных дзеянняў па ўзоры |
| 4 (чатыры) | Узнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне з элементамі тлумачэння асноўных азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); прымяненне ведаў і ўменняў у знаёмай сітуацыі па ўзоры; наяўнасць адзінкавых істотных памылак |
| 5 (пяць) | Асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (тлумачэнне тэрмінаў і азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); прымяненне ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры; наяўнасць адзінкавых істотных памылак |
| 6 (шэсць) | Поўнае веданне і асэнсаванае ўзнаўленне ўсяго вучэбнага праграмнага матэрыялу, валоданне вучэбным праграмным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (апісанне і тлумачэнне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); выкананне заданняў па ўзоры на аснове прадпісанняў; наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўнае, трывалае веданне і асэнсаванае ўзнаўленне ўсяго вучэбнага праграмнага матэрыялу, валоданне вучэбным праграмным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і тлумачэнне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне пэўных моўных сродкаў, валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй), недастатковае самастойнае выкананне заданняў; наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўнае, трывалае, глыбокае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і тлумачэнне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне моўных сродкаў, валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); самастойнае выкананне заданняў; наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 | Поўнае, грунтоўнае, глыбокае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, аперыраванне праграмным |

| Адзнака у балах | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| (дзевяць) | вучэбным матэрыялам у часткова зменены сітуацыі (прымяненне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне моўных сродкаў, свабоднае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); самастойнае выкананне заданняў |
| 10 (дзесяць) | Свабоднае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам; прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай сітуацыі (самастойныя дзеянні пры апісанні, тлумачэнні, аналізе, параўнанні, ацэньванні тэрмінаў і азначэнняў, выкарыстанне адпавядаючых сітуацыі прафесіянальных зносін моўных і маўленчых сродкаў); знаходлівасць пры рашэнні нестандартных, праблемных задач |

Заўвага. Пры адсутнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцам, якія навучаюцца ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай (сярэдняй спецыяльнай) адукацыі выстаўляецца ”0” (нуль) балаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК АБСТАЛЯВАННЯ ВУЧЭБНАГА КАБІНЕТА

| Назва | Колькасць |
|---|---|
| **Тэхнічныя сродкі навучання** | |
| Тэхнічнае абсталяванне | |
| Мультымедыйны праектар | 1 |
| Камп’ютар | 1 |
| Дыдактычнае забеспячэнне | |
| Прэзентацыі вучэбнага прызначэння па тэмах вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ | Камплект |
| **Электронныя сродкі навучання** | |
| Электронныя слайды па тэмах вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) ”Беларуская мова (прафесійная лексіка)“ | Камплект |
| **Абсталяванне кабінета** | |
| Дошка аўдыторная | 1 |
| Крэсла | 31 |
| Стол для выкладчыка | 1 |
| Стол для навучэнцаў | 15 |
| Стэнд інфармацыйны | 1 |
| Шафа | 1 |
| Экран праекцыйны | 1 |

## ЛІТАРАТУРА

**Абражэвіч, І.У.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Машынабудаванне : дапам. / І.У. Абражэвіч. Мінск : РІПА, 2016. 96 с.

**Бандаровіч, В.У.** Стыльна па-беларуску: комплексны даведнік па культуры маўлення / В.У. Бандаровіч. Мінск : Пачатк. шк., 2013. 63 с.

**Батура, Т.В.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Аўтаматызацыя : вучэб. дапам. / Т.В. Батура. Мінск : РІПА, 2018. 113 с.

**Беларуская** мова : вучэб. дапам. / В.М. Богдан [і інш.] ; пад рэд. Л.П. Тамілінай. Мінск : РІПА, 2019. 381 с.

**Беларуская** мова (прафесійная лексіка). Педагогіка : вучэб. дапам. / Д.В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д.В. Дзятко. Мінск : РІПА, 2020. 279 с.

**Беларуская** мова (прафесійная лексіка). Транспарт : вучэб. дапам. / І.У. Будзько [і інш.] ; пад агул. рэд. Л.А. Гіруцкай. Мінск : РІПА, 2019. 223 с.

**Беларуская** мова (прафесійная лексіка). Эканоміка: практыкум : вучэб. дапам. / Д.В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д.В. Дзятко. Мінск : РІПА, 2020. 207 с.

**Зразікава, В.А.** Беларуская мова. Прафесійная лексіка для эканамістаў : вучэб. дапам. / В.А. Зразікава, А.В. Губкіна. Мінск : Выш. шк., 2016. 383 с.

**Маршэўская, В.В.** Беларуская мова. Прафесійная лексіка для юрыстаў і эканамістаў : вучэб. дапам. / В.В. Маршэўская, А.С. Садоўская. Мінск : РІВШ, 2020. 231 с.

**Сычанава, Н.М.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Энергетыка : вучэб. дапам. / Н.М. Сычанава. Мінск : РІПА, 2019. 99 с.

**Чатырка, Д.М.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Грамадскае харчаванне : вучэб. дапам. / Д.М. Чатырка. 2-е выд., стэр. Мінск : РІПА, 2018. 153 с.

**Шабліцкая, Н.В.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Будаўніцтва : вучэб. дапам. / Н.В. Шабліцкая. Мінск : РІПА, 2020. 131 с.

**Шпак, Т.Ю.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Сельская гаспадарка : вучэб. дапам. / Т.Ю. Шпак. Мінск : РІПА, 2019. 299 с.

**Шумчык, В.С.** Беларуская мова (прафесійная лексіка). Вылічальная тэхніка : вучэб. дапам. / Ф.С. Шумчык, Н.М. Акуліч. Мінск : РІПА, 2018. 147 с.

## СЛОЎНІКІ

**Беларускі** арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы ; уклад. Л.П. Кунцэвіч. Мінск : Беларус. навука, 2012. 694 с.

**Маракуліна, Т.М.** Слоўнік арфаграфічных наваўвядзенняў беларускай мовы / Т.М. Маракуліна, І.Л. Капылоў. Мінск : Соврем. шк., 2011. 96 с.

**Разам,** асобна, праз злучок : даведнік : дапам. для настаўнікаў / склад. : Н.Д. Бандарэнка, І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна ; пад рэд. А.А. Лукашанца. Мінск : Аверсэв, 2013. 192 с.
**Русско-белорусский** словарь : в 3 т. / под рэд. А.А. Лукашанца. 10-е изд., перераб. и доп. Мінск : БелЭн, 2012.
**Русско-белорусский** политехнический словарь : в 2 т. / под ред. И.Л. Бурак [и др.]. Минск : Беларус. навука, 1998.
**Тлумачальны** слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. 3-е выд. Мінск : БелЭн, 2002. 784 с.